ПРЫЯРЫТЭТЫ, ВЫНІКІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Учора Аляксандр Лукашэнка правёў шэраг сустрэч па міжнародным кірунку, прычым іх тэматыка атрымалася вельмі шырокай — ад спорту і сяброўства да экспартных паказчыкаў.

Сустрэча першая.

Размова пра экспарт і графік Прэзідэнта

У пачатку сустрэчы з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем беларускі лідар падкрэсліў: першае і асноўнае пытанне — гэта аналіз знешнеэканамічнай дзейнасці. «Калі закранаць нашу знешнюю палітыку, у нас тут больш-менш стабільная сітуацыя. Што датычыцца ўвогуле знешнепалітычных прыярытэтаў, яны вызначаны — падабаюцца яны камунебудзь ці не, шматвектарнасць знешняй палітыкі вынікае з нашага месца ў свеце, вызначанага Госпадам Богам, і ад гэтага нікуды не дзенешся», — дадаў ён.

Прэзідэнт нагадаў, што эканоміка — гэта прыярытэт № 1. «Калі чагосьці баяцца, то трэба баяцца і дрыжаць за эканоміку, каб яна развівалася як мае быць. Ну а экспарт — гэта аснова нашай эканомікі, у нас экспартаарыентаваная дзяржава, таму знешнеэканамічная дзейнасць наша з акцэнтам на экспарт».

Другое пытанне — кантакты Прэзідэнта на найвышэйшым узроўні на астатні адрэзак гэтага года, асноўныя мерапрыемствы ўнутры краіны і з выездам за яе межы. Па словах кіраўніка дзяржавы, была дамоўленасць аб тым, што гэты аспект павінен быць сістэматызаваны.

Уладзімір Макей адзначыў, што па знешнеэканамічнай дзейнасці ёсць пэўныя пазітыўныя нюансы. «За першае паўгоддзе гэтага года экспарт вырас амаль на 20 % (19,4 %). Ідзе рост на ўсіх рынках — у залежнасці ад рынку ад 4 % да амаль 30 %. Гэта станоўчыя моманты, — падсумаваў Уладзімір Макей. — Вельмі актыўна развіваецца знешнеэканамічная дзейнасць з Кітаем. У нас тут рост на 37 %, пайшла сельскагаспадарчая прадукцыя».

Па выніках працоўнай сустрэчы Уладзімір Макей пагутарыў з журналістамі і адзначыў, што ёсць шэраг зрухаў, захоўваецца пазітыўнае сальда знешняга гандлю. Разам з тым, дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства, зразумела, што не трэба цешыць сябе. «На жаль, адбываецца зніжэнне на працягу года дынамікі росту экспарту, — падкрэсліў ён. — Доля высокатэхналагічных тавараў у агульным экспарце нашай прадукцыі застаецца невысокай — гэта 2,5 % у цэлым і менш за 1 % на рынках Еўрапейскага саюза».

Міністр замежных спраў таксама дадаў, што не ўдалося дасягнуць дыверсіфікацыі ў маштабе траціна — траціна — траціна на рынках ЕАЭС, ЕС і краін Далёкай дугі. Пры гэтым павысіўся ўзровень экспарту ў краіны Еўрапейскага саюза і Далёкай дугі, знізіўся — у ЕАЭС.

Што датычыцца замежных устаноў Беларусі, то пераважная большасць з іх выконвае даведзеныя заданні па экспарце — гэта 45 устаноў, па 12 краінах дапушчана адставанне, таму Прэзідэнту было даложана аб тых мерах, якія плануецца прыняць. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу: рост экспарту па выніках года ва ўсіх краінах, з якімі супрацоўнічае Беларусь, а гэта 171 дзяржава.

Акрамя таго, беларускаму лідару быў прадстаўлены графік кантактаў на высокім узроўні як унутры краіны, так і за яе межамі. Узгоднены некаторыя канкрэтныя даты візітаў. «Да канца года плануецца вельмі актыўны графік у кіраўніка дзяржавы. Да нас будзе прыязджаць шэраг дзеячаў, мы плануем правесці некалькі важных мерапрыемстваў — гэта канферэнцыя АБСЕ па барацьбе з тэрарызмам у кіберпрасторы і сустрэча асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы», — расказаў Уладзімір Макей.

Паводле яго слоў, плануецца ўдзел Прэзідэнта ў гэтых мерапрыемствах, таму былі даложаны канкрэтныя прапановы з фарматам яго ўдзелу.

Што датычыцца геаграфіі замежных паездак беларускага лідара, плануецца шэраг паездак і па лініі розных інтэграцыйных структур — і ЕАЭС, і СНД, і АДКБ. Ёсць шэраг двухбаковых візітаў, найбліжэйшы — ва Узбекістан, па астатніх праводзяцца дадатковыя ўзгадненні.

На пытанне аб тым, ці абмяркоўвалася з Прэзідэнтам тэма гандлёвых супярэчнасцяў з Расіяй і роля МЗС у іх урэгуляванні, Уладзімір Макей нагадаў, што на найбліжэйшы час запланаваны кантакты кіраўнікоў дзяржаў з удзелам прадстаўнікоў двух урадаў. «Я думаю, трэба пачакаць вынікаў гэтых сустрэч. Перакананы, што з улікам таго, што абедзве дзяржавы імкнуцца канструктыўна падыходзіць да наяўных рознагалоссяў і праблем, нам удасца вырашыць тыя некаторыя рознагалоссі, якія існуюць на дадзены момант», — дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Сустрэча другая.

Пра блізкіх сяброў

У пачатку размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Ле Анем, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне, Прэзідэнт заявіў: нягледзячы на тое што падобныя сустрэчы носяць пратакольны характар, яны важныя з пункту гледжання тых прыярытэтаў, якія Беларусь сёння выбудоўвае. «Для нас В'етнам — адзін з сур'ёзных знешнепалітычных прыярытэтаў, я нават скажу адкрыта — вы нам людзі не чужыя. Вы родныя для нас людзі, паколькі ў нашай гісторыі было тое, што бывае толькі з блізкімі людзьмі, — адзначыў беларускі лідар. — Мы разам змагаліся з вамі за суверэнітэт і незалежнасць В'етнама, і ў тым росквіце, які намеціўся ў В'етнаме, у тых поспехах, якія вы сёння маеце, мабыць, ёсць пэўная заслуга савецкага чалавека».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяперашнія адносіны дзвюх дзяржаў заснаваныя менавіта на падмурку і ідэалогіі таго перыяду, а таксама ўсіх тых кантактах ужо суверэннай незалежнай Беларусі і В'етнама. «Хачу вас запэўніць, перадайце гэта кіраўніцтву В'етнама, што бліжэйшых сяброў у свеце вы не знойдзеце», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў: у Беларусі вельмі цэняць тое, што В'етнам і яго кіраўніцтва ставяцца да нашай краіны адпаведным чынам. «Вы заўсёды будзеце бачыць у нас не проста надзейных партнёраў — гэта не абмяркоўваецца, — блізкіх людзей, якія гатовы прыйсці вам на дапамогу ў любую хвіліну для таго, каб народ В'етнама, шматпакутны народ, жыў і квітнеў», — падкрэсліў беларускі лідар.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, нашы палітычныя адносіны, дыпламатыя значна апярэджваюць гандлёва-эканамічныя адносіны — такі аспект неабходна падцягваць і актывізаваць, Беларусь да гэтага гатовая. Вельмі важна і тое, што ўсё, што вырабляецца ў Беларусі, запатрабавана ў В'етнаме, у сваю чаргу і В'етнам вырабляе вельмі шмат тавараў, якія закупляе наша краіна на знешніх рынках.

Прэзідэнт падзякаваў Ле Аню за ўсё добрае, што ён зрабіў для збліжэння дзвюх дзяржаў і двух народаў. Па словах кіраўніка дзяржавы, вельмі хацелася б, каб новы пасол В'етнама ў Беларусі працягнуў тую палітыку, якую ажыццяўляў яго папярэднік.

Па выніках сустрэчы пасол пагутарыў з журналістамі. Ле Ань адзначыў, што Беларусь і В'етнам могуць узаемна дапаўняць адно аднаго ў розных сферах — у сельскай гаспадарцы, вытворчасці мясных, малочных прадуктаў, будаўніцтве, адукацыі, турызме і ваеннай галіне, каб дасягнуць мэты ў 500 мільёнаў долараў тавараабароту. Ён перакананы: калі кампетэнтныя органы дзвюх дзяржаў будуць працаваць больш актыўна, то бакі змогуць дасягнуць агульнай мэты.

Сустрэча трэцяя.

Пра падрыхтоўку да Еўрапейскіх гульняў

Як заявіў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янэз Качыянчыч па выніках сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўнік беларускай дзяржавы не па чутках ведае аб спорце і выдатна ў ім разбіраецца. «Мая мэта заключалася ў тым, каб расказаць яму пра працэс падрыхтоўкі да Еўрапейскіх гульняў, якія адбудуцца менш чым праз 10 месяцаў. На мой погляд, падрыхтоўка арганізавана вельмі добра, сітуацыя ў цэлым вельмі радасная. Мы лічым, што Беларусь зможа правесці выдатныя гульні», — падкрэсліў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў.

«Я таксама хацеў бы скарыстацца магчымасцю і падзякаваць ураду Рэспублікі Беларусь і яе лідарам за ўвядзенне бязвізавага рэжыму для гасцей дадзенага мерапрыемства, у прынцыпе для ўсіх — не толькі спартсменаў і гледачоў, а для ўсіх, хто хацеў бы прыехаць сюды і адкрыць для сябе Рэспубліку Беларусь. Спадзяюся, што вы, беларусы, зможаце скарыстацца гэтай выдатнай магчымасцю для таго, каб паказаць усяму свету, што ж такое сучасная і квітнеючая Беларусь», — сказаў Янэз Качыянчыч.

Падчас самой сустрэчы беларускі лідар адзначыў, што ў нашай краіне нямала зрабілі для паспяховага правядзення Еўрапейскіх гульняў, аднак нейкія недапрацоўкі, напэўна, прысутнічаюць — іх і папрасіў агучыць кіраўнік дзяржавы.

Янэз Качыянчыч расказаў журналістам, што ў найбліжэйшыя 10 месяцаў арганізацыйнаму камітэту трэба ўрэгуляваць невялікія тэхнічныя пытанні, тады як усе астатнія ўжо былі вырашаны.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

КАЛІ ХАТА НІКОМУ НЕ ТРЭБА...

Падпісаны ўказ, накіраваны на змяншэнне колькасці безгаспадарных і аварыйных будынкаў

У беларускіх вёсках больш за 30 тысяч дамоў прызнаныя старымі і звыш 10 тысяч — пустуючымі. Ці з'явяцца на гэтых участках гаспадары? Вырашэнню гэтага пытання будзе спрыяць новы ўказ «Аб пустуючых і старых дамах», які падпісаў учора Прэзідэнт. Больш падрабязна пра новаўвядзенні карэспандэнту БелТА расказала намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прававога забеспячэння зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі юрыдычнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Антаніна ТОРБІНА.

Прамы продаж

Новы ўказ распаўсюджвае сваё дзеянне на ўсю тэрыторыю Беларусі, а не толькі на сельскую мясцовасць, як гэта прадугледжваў Указ № 100, які страціў сілу. Пры гэтым прапануюцца розныя варыянты ўключэння ў абарот пустых і старых дамоў, прызнаных камунальнай уласнасцю. З'явілася магчымасць іх прамога продажу. Адпаведныя прапановы па асобных аб'ектах будуць публікавацца на сайтах мясцовых выканкамаў. Калі на працягу 30 дзён заяву на куплю падасць толькі адзін чалавек, з ім будзе заключаны дагавор куплі-продажу. Правядзенне аўкцыёну прадугледжана пры паступленні некалькіх заяў. Пры гэтым магчымасць прамога продажу ёсць на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў і Мінска. Аблвыканкамы будуць мець права вызначаць з улікам інтарэсаў дзяржавы і мясцовых умоў іншыя населеныя пункты, на тэрыторыі якіх жылыя дамы будуць адчужацца толькі па выніках аўкцыёнаў.

«Магчымасць арганізацыі прамога продажу даецца з улікам попыту на нерухомасць і з мэтай зніжэння выдаткаў, бо на арганізацыю аўкцыёну патрабуюцца пэўныя грашовыя сродкі, якія пакрывае пераможца аўкцыёну», — адзначыла Антаніна Торбіна.

Зямельны ўчастак у абмен на знос

Упершыню ў грамадзян з'явілася магчымасць атрымаць зямельны ўчастак, не выкупляючы пустуючы або стары дом, на якім ён размешчаны. Але гэта пры ўмове самастойнага зносу такога дома альбо фінансавання падобных работ. Участак можна атрымаць без правядзення аўкцыёну на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў. У такіх гарадах участкі могуць быць атрыманыя без аўкцыёну толькі грамадзянамі, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, і ў Мінску — толькі шматдзетнымі сем'ямі, якія стаяць на такім уліку.

У якім выпадку дом прызнаецца пустуючым або старым

Для выяўлення такіх дамоў спецыяльныя камісіі пры мясцовых выканкамах будуць двойчы ў год аглядаць нерухомасць на адпаведных тэрыторыях. Указам пашыраны склад гэтых камісій і дэталёва рэгламентаваны парадак іх работы.

Раней былі ўстаноўлены больш жорсткія ўмовы для прызнання жылых дамоў пустуючымі: неабходнасць пражывання ў іх уладальнікаў не менш за месяц на працягу кожнага года на працягу трох гадоў.

«Цяпер не будуць прызнавацца пустуючымі дамы, у якіх асобы, якія маюць права валодання і карыстання імі, пражывалі на працягу апошніх трох гадоў хоць бы адзін дзень. Пустыя дамы будуць вызначаць камісіі пры візуальным агляде. Калі ўстановяць відавочную адсутнасць жыхароў на працягу доўгага часу, будзе правярацца наяўнасць аплаты камунальных плацяжоў, расходу электраэнергіі, — растлумачыла Антаніна Торбіна. — У складзе камісій будуць і прадстаўнікі органаў унутраных спраў, якія апытаюць суседзяў, ці прыязджалі ў дом уласнікі або іншыя асобы, якія маюць права валодання і карыстання ім. Матэрыялы апытання, фатаграфіі будуць прыкладацца да заключэння камісіі. На падставе праверкі ўсіх абставін мясцовыя выканкамы будуць прымаць рашэнне аб уключэнні дома ў рэестр пустуючых дамоў».

Паведамленне пра намер выкарыстоўваць жылы дом для пражывання зараз можна падаваць у мясцовы выканкам не толькі асабіста, але і звычайным лістом, па электроннай пошце, факсе — любым даступным спосабам. Пры гэтым такое паведамленне можа падаць не толькі ўласнік, але і іншыя асобы, якія маюць права валодання і карыстання жылым домам, пры прадстаўленні пацвярджальных дакументаў. Падаўшы паведамленне, уладальнік дома абавязваецца ўтрымліваць зямельны ўчастак у належным стане.

Да старых папярэдні ўказ адносіў усе дамы, прызнаныя непрыдатнымі для пражывання, у якіх грамадзяне, што маюць права карыстання імі, не пражывалі на працягу года і не прымалі мер да іх аднаўлення. Згодна з дзейным заканадаўствам, камісіі будуць працаваць толькі з аварыйнымі і блізкімі да абвалу дамамі, даведзенымі да такога стану безгаспадарчымі дзеяннямі ўласніка.

«Стан дома будзе ацэньвацца на падставе візуальнага агляду. У склад камісіі ўвойдуць прадстаўнікі арганізацый, здольныя вызначыць адпаведнасць дома крытэрыям, якія дазваляюць аднесці яго да аварыйных або, да такіх, што знаходзяцца пад пагрозай абвалу. Мясцовы выканкам будзе падаваць заяву ў суд аб выкупе такога дома або продажы з публічных таргоў, калі пасля накіравання паведамленняў уласнік не прыступіў да яго аднаўлення, не звярнуўся па атрыманне дазволу на рэканструкцыю і не згодны знесці яго», — расказала Антаніна Торбіна.

Мінімальныя тэрміны аднаўлення або зносу дамоў падаўжаюцца да года. Пры гэтым калі ва ўласніка былі ўважлівыя прычыны, якія перашкаджалі аднаўленню дома, то пра іх можна паведаміць выканкаму, і гэты тэрмін можа быць прадоўжаны.

Максімальная абарона інтарэсаў уласнікаў

У новым указе прапісаны механізм магчымага вяртання ўласніку пустуючага або старога жылога дома, ужо перададзенага ў камунальную ўласнасць. Калі ўласнік не падаў паведамленне ў выканкам і ў яго былі на гэта ўважлівыя прычыны, якія невядомыя мясцоваму выканкаму, то гэты дом павінен быць яму вернуты (рашэнне прымае суд). Ва ўказе таксама прадугледжана магчымасць выплаты за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў кампенсацыі, калі дом знеслі, альбо выплаты грошай, выручаных ад продажу дома, калі дом быў адчужаны.

Новы дакумент захаваў базавыя падыходы ранейшага ўказа, якія паказалі сваю эфектыўнасць. Разам з тым ён пашырае магчымасці для ўключэння старых і пустуючых дамоў у абарот, пакідаючы ўласнікам вялікія магчымасці для захавання маёмасці.